View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by BSU Digital Library

# ФАРМІРАВАННЕ НЯМЕЦКАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ НА АКУПАВАНЫХ ТЭРЫТОРЫЯХ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1915–1918 ГГ.)

***В. Волкава*** *(БДУ)*
*Навуковы кіраўнік:*
*кандыдат гіст. навук, дацэнт* ***В.В. Пупа***

*У артыкуле даследуецца працэс фарміравання адміністрацыі акруг "Літва" і "Беласток – Гродна" ваенна – адміністрацыйнай адзінкі Обер Ост пасля ўстанаўлення лініі фронту Дзвінск – Браслаў – Паставы – Смаргонь – Баранавічы – Пінск восенню 1915 г. Разглядаецца тэрытарыяльна-прававы аспект змяненняў адміністрацыйных межаў у рамках рэгіёну.*

*In the article the process of formation of the administration of districts «Litva» and «Bialystok – Grodno» within the bounds of the military administrative unit Ober Ost after determination of the front line Dvinsk – Braslav – Postavy – Smorgon – Baranovitchi – Pinsk in autumn of 1915 is investigated. The territorial and legal aspects of changes of administrative borders within the bounds of the region are analyzed.*

Жнівеньскае наступленне нямецкіх войскаў разгортвалася ў кірунку Коўна – Вільня– Мінск. 30 жніўня 1915 г. фронт знаходзіўся на лініі Гродна – Свіслач – Пружаны. У верасні былі заняты Гродна, Вілейка, трохі пазней – Навагрудак, Баранавічы, Пінск. 18 верасня 1915 г. нямецкія войскі ўвайшлі ў Вільню. Яны занялі Польшчу, Літву, Курляндыю, дасягнуўшы пад канец верасня лініі Дзвінск – Паставы – Смаргонь – Баранавічы – Пінск. 2 кастрычніка расійска-нямецкі фронт надоўга стабілізаваўся. Ваенныя аперацыі ўзнавіліся толькі 18 лютага 1918 г. нямецкім наступленнем на ўсход. Такім чынам, на працягу больш чым двух гадоў лінія фронту падзяляла Беларусь на дзве часткі. Паводле беларускага гісторыка В. Круталевіча, пад нямецкай акупацыяй апынуліся заходнія абшары краіны плошчаю 50 тыс. км$^2$ , што складала прыкладна 25 % сучаснай тэрыторыі Беларусі [1, с. 154]. Параза ў 1915 г. каштавала Расіі 15 % яе тэрыторый, 10 % чыгуначных шляхоў, 30 % прамысловасці. Адна пятая насельніцтва або збегла, або трапіла пад нямецкую акупацыю [2, с. 208].

Пасля ўстанаўлення лініі фронту восенню 1915 г. на занятых тэрыторыях было створана военна-адміністрацыйнае ведамства Обер Ост. Само абазначэнне Обер Ост (*Ober–Ost*) узнікла ад скарачэння нямецкай назвы вайсковай пасады нямецкага фельдмаршала Гіндэнбурга – Вярхоўны галоўнакамандуючы на Усходзе (ням. – Oberbefehlshaber Ost) і пазней была перанесена на ўсю мясцовую нямецкую адміністрацыю, якая падпарадкоўвалася камандаванню Усходняга фронту, а таксама і на ўсю тэрыторыю, што знаходзілася пад юрысдыкцыяй апошняга. У склад ведамства ўвайшлі сучасныя заходнія беларускія землі (часткі Ваўкавыскага і Гродзенскага паветаў), сучасныя польскія землі (Беластоцкі, Бельскі, Сакольскі). На адрэзку ад Ліды да Браслава ўсходняя мяжа Обер Оста амаль супадала з сучаснай мяжой паміж Літвой і Беларуссю. Частка акупаваных беларускіх земляў плошчаю каля 33 тыс. км$^2$ з населенымі пунктамі Ашмяны, Наваградак, Слонім, Баранавічы, Пінск, Пружаны ўваходзіла ў склад вайскова-аперацыйнай паласы *(Operationsgebiet)* паміж мяжой Обер Оста і лініяй нямецка-расійскіх акопаў [3, с. 74]. Гэта тэрыторыя стала прыфрантавой паласой. Тут было сканцэнтравана больш за 1,5 млн рускіх салдатаў і афіцэраў Заходняга фронту і каля 1 млн нямецкіх. Заходні фронт быў утвораны ў жніўні 1915 г. у выніку падзелу расійска-германскага фронту на тры: Паўночны, Заходні і Паўднева-Заходні. Заходні фронт прыкрываў маскоўскі напрамак і займаў пазіцыі ад мястэчка Відзы да ракі Прыпяць [4, с. 55]. Адносна гэтых абшараў нямецкі ўрад не меў анэксійных намераў. Яны павінны былі адыграць сваю ролю ў будучых мірных перамовах і вярнуцца да Расіі пасля адмаўлення апошняй ад прэтэнзій на землі, далучаныя да Обер Оста.

Створанае на частцы занятых паўночна-ўсходніх земляў вайсковае адміністрацыйнае ведамства Обер Ост узначаліў шэф генеральнага штаба генерал Эрых Людэндорф пад агульным кіраўніцтвам камандуючага Усходнім фронтам фельдмаршала Паўля фон Гіндэнбурга. Агульная плошча Обер Оста складала 108,8 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 2,9 млн чалавек. Пасля ўпарадкавання адміністрацыйнага падзелу да сакавіка 1916 г. Обер Ост меў пяць абласцей кіравання: Літва (1 горад, які меў статус асобнага краявога раёна (павета) і 19 краевых раёнаў) з плошчай 36 300 км$^2$ , Вільня (адпаведна 1 і 5) – 9 300 км$^2$, Сувалкі (7 краевых раёнаў) з плошчай 14 900 км$^2$, Беласток (1 і 7) – 17 500 км$^2$, Гродна (1 і 4)– 9 100 км$^2$. Аднак унутраная структура прыцярпела шматлікія змены: ужо ў маі 1916 г. акругі Вільня і Сувалкі былі аб'яднаны, 16 сакавіка 1917 разам з акругай Літва яны склалі "Ваеннае ўпраўленне Літва", 1 лістапада 1916 г. было створана аб'яднанае "Ваеннае ўпраўленне Беласток-Гродна" (1 горад і 14 краевых раёнаў) [5, с. 8]. У межах гэтай акругі апынулася трэцяя частка акупаваных беларускіх зямель плошчаю 17,2 тыс. км$^2$, на Польшчу прыпадае 9,2 тыс. км$^2$ (усяго 26 394 км$^2$). У акругу Беласток – Гродна ўваходзілі краявыя раёны: Алекшыцы, Беласток (горад), Беласток (краявы раён), Бельск, Гродна (горад), Гродна (краевы раён), Ліда, Ост, Планты, Радунь, Саколка, Свіслач, Васілішкі, Ваўкавыск [6, с. 430 – 432].

Адміністрацыйная структура вясной 1917 г. падзялялася на тры адміністрацыйныя адзінкі: Літву, Курляндыю і Беластоцка-Гродзенскую акругу [6, с. 433]. 1 лютага 1918 г. ваенныя ўпраўленні Літва і Беласток – Гродна былі аб'яднаны ў складзе "Нямецкага ваеннага ўпраўлення Літва" адпаведна пад назвамі "Літва-поўнач" і "Літва-поўдзень". Былы кіраўнік "Нямецкага ваеннага кіраўніцтва Беласток-Гродна" фон Хеппе стаў кіраўніком аб'яднанай акругі. Вобласць "Літва-поўдзень" была падначалена капітану фон Узлару.

Для ажыццяўлення адміністрацыйных функцый на пачатку фарміравання Обер Ост былі створаны этапныя інспекцыі на чале з этапнымі камендантамі, якія ажыццяўлялі свае ваенныя абавязкі па падтрыманню ў краіне парадку з дапамогай этапных войск і палявой паліцыі, што мелася ў іх распараджэнні. Пазней этапныя інспекцыі з'яўляліся вышэйшай аб'яднаўчай інстанцыяй паміж ваеннымі і адміністрацыйнымі ўладамі.

На акупаванай тэрыторыі, як адзначаў Э. Людэндорф, "спачатку трэба было забяспечыць парадак і спакой у армейскім тыле і выключыць шпіянаж" [7, с. 185]. Разам з ваенным штабам генерала Э. Людэндорфа ствараўся вялікі адміністрацыйны штаб, на пасаду кіраўніка якога 4 лістапада 1915 г. быў прызначаны генерал фон Эйзенгарт-Роцэ [3, с. 80]. На чале адміністрацыі краю знаходзілася ўпраўленне Обер Оста *(Ober-Kommando)* ў Коўне, са студзеня 1917 г. – у Беластоку, з мая 1918 г. – зноў у Коўне. Для кіравання ваеннымі акругамі ствараліся адпаведныя *General-Kommando* на чале з беціркхаутманамі (*Bezirkhautmann*). Кіраванне краевымі раёнамі (Kreis) ажыцяўлялася пад кіраўніцтвам крейсхаўтманаў *(Kreishauptmann)* і амтхаўтманаў *(Amthauptmann).*

Упраўленне Обер Ост мела ў сваім складзе наступныя аддзелы: палітычны (*Abteilung V*), фінансаў (*Ab.VI*), сельскай гаспадаркі (*Ab.VIIa*), лясніцтва (*Ab.VIIв*), царкоўных і школьных спраў (*Ab.VIII*), юстыцыі ((*Ab.IX*), прэсы (*Ab.X*), гандлю (*Ab.XI*), культуры краю (*Ab.XII*) [5, с. 7–8]. Самым галоўным быў палітычны. Яго мэтай было падтрыманне сувязі паміж ваеннымі кіраўнікамі новаўтворанай ваенна-адміністрацыйнай адзінкі з цывільнымі і ваеннымі ведамствамі ў Германіі. Гэтым аддзелам спачатку кіраваў зяць Э. Людэндорфа фон Брукхузен, а з 11 лістапада 1916 г. пасаду заняў прадстаўнік прускай ваеннай сям'і фон Гауль [3, с. 82]. Аддзел каардынаваў працу астатніх аддзелаў, вырашаў палітычныя і нацыянальныя пытанні Обер Оста (вылучаліся нямецкая, польская, літоўская, беларуская і яўрэйская секцыі).

Схема адзінага ўпраўлення ў розных акругах праводзілася паступова, на аснове палажэння аб упраўленні ад 7 чэрвеня 1916 г. [8, с. 93]. Згодна §6 галоўнай задачай

кіраўніцтва з'яўлялася фарміраванне і захаванне ўпарадкаваных палітычных і эканамічных адносін у занятай вобласці. Інтарэсы арміі і Германскай імперыі заўжды павінны былі знаходзіцца вышэй за інтарэсы краю [6, с. 83]. Такім чынам, прыярытэтам для нямецкага кіраўніцтва на 1915 г. стала хутчэйшае распаўсюджанне сваёй улады. Тэрыторыя ўздоўж фронта (аператыўны раён) заставалася ў непасрэдным вядзенні штабоў армій.

Служачыя ў акупацыйную адміністрацыю прызначаліся з ліку ваенных, не здатных больш для службы ў дзеючай арміі. Але ж набіраліся і неваенныя спецыялісты для працы ў сельскай гаспадарцы, лясной справе, фінансах, царкве і школе. Да выбару служачых адміністрацыйныя ўлады ставіліся з засцярогай: "Трэба мець у чужым краі надзейных людзей. Мясцовыя жыхары прымаліся на службу толькі ў Курляндыі, і то з вялікім разборам" [7, с. 188].

Упраўленню Обер Оста ў Коўне падпарадкоўваліся шэфы ваенна-адміністрацыйных адзінак са сваімі бюракратычнымі апаратамі. Згодна новаму тэрытарыяльна-адміністрацыйнаму падзелу акругі былі падзелены на паветы, якія па сваіх памерах прыкладна раўняліся этапным раёнам на захадзе, але былі больш дробнымі, чым даваенныя расійскія. На павятовых кіраўніках *(Kreishauptmann)* ляжала асноўная адказнасць у тэхнічна-адміністрацыйных і гаспадарчых адносінах. Ім падначальваліся бургамістры малых гарадоў і валасныя кіраўнікі сельскіх мясцовасцей, а таксама суддзя, які мог па патрэбе замяніць павятовага кіраўніка [19, 14 сакавіка]. На чале кожнага горада стаяў обербургамістр, якому падначальваліся два дарадцы – бургамістры. Роўнымі правамі з павятовымі кіраўнікамі карысталіся кіраўнікі найбольш буйных гарадоў. Для эканамічнага выкарыстання краю пры павятовым кіраўніку меліся асобыя гаспадарчыя чыны *(Amthauptmann),* у абавязкі якіх уваходзіла назіранне за апрацоўкай зямлі і эксплуатацыяй маёнткаў, а таксама праца па павелічэнні вытворчасці і выкарыстанні ўраджаю. Іншыя дадатковыя службы служылі павятовым кіраўнікам для здабычы рознай ваеннай сыравіны.

Павятовыя кіраўнікі, як паліцэйскія органы ўлады, мелі жандармерыю. Мясцовыя паліцэйскія органы былі сфарміраваны з ліку адкамандзіраваных з фронту салдат старэйшага ўзросту, бо кіраўніцтва не магло забяспечыць жандараў і паліцэйскіх з Германіі. Яны праходзілі спецыяльнае навучанне, аднак мелі праблемы з насельніцтвам, бо не ведалі ніводнай з мясцовых моў. Для падтрымання парадку ў Вільні яшчэ расійскімі ўладамі была створана міліцыя з добраахвотнікаў, з яе была арганізавана паліцыя, якая знаходзілася пад загадам нямецкага ўпраўлення пры обер-бургамістры. Апрача таго была створана ваенная паліцыя пры губернатарах [9, 16 сакавіка].

У структуру краіны адпаведна з тэрытарыяльна-адміністрацыйным падзелам на паветы ўвайшлі судзебныя органы, якія былі падначалены акруговым судам. У кожным павеце быў зацверджаны павятовы суд для мясцовага насельніцтва. Павятовыя суды былі падначалены акруговым судам. Мясцовыя суды дзейнічалі ў Вільні, Гродна, Шчучыне, Васілішках, Лідзе, Ваўкавыску, Беластоку і іншых гарадах. Вярхоўнай судовай інстанцыяй з'яўляўся Вышэйшы суд у Коўне пад кіраўніцтвам сенатара Кратценберга. Паралельна мясцовым судам дзейнічалі адпаведныя ваенна-палявыя суды.

Нямецкі наступ, які пачаўся 18 лютага 1918 г., змяніў сітуацыю ў Беларусі. У лютым–сакавіку 1918 г. Германія захапіла новыя раены. Нямецкія войскі выйшлі на лінію Россоны – Полацк – Орша – Жлобін, прасунуліся ў некаторых месцах на 250 км. Ад Жлобіна лінія фронта паварочвалася на паўдневы ўсход да Новазыбкава, пакінуўшы ў зоне акупацыі Гомель. Такім чынам, пад уладай саветаў заставалася толькі 40 тыс. км$^2$.

Акупаваныя ў лютым – сакавіку 1918 г. новыя раёны Беларусі пераходзілі пад кіраўніцтва 10-й нямецкай арміі на чале з генералам Э. Фалькенгайнам, былым ваенным міністрам Германіі. На акупаванай тэрыторыі была створана новая адміністрацыя. Згодна з § 5 "Распараджэння аб арганізацыі ваеннага кіраўніцтва на зноў акупанай вобласці" уводзіўся новы тэрытарыяльны падзел [10]. Адміністрацыя стваралася па знаёмай схеме: упраўленне Обер

Ост у Коўне, для ваенных акруг адпаведныя *General – Kommando i* мясцовая адміністрацыя з крайсхаўтманамі і амтхаўтманамі ( § 3, § 9). У кожным акупаваным горадзе і ў вялікіх вёсках размясціліся германскія гарнізоны на чале з камендантамі. Кіраўнікі краявых раёнаў прызначаліся на пасаду Генерал-камандо [10].

Адметнай рысай нямецкай акупацыйнай палітыкі з'явілася яе антысавецкая накіраванасць. Органы савецкай улады ўсюды былі ліквідаваны, а дэпутаты, камуністы, згодна з загадам нямецкага камандавання, падлягалі арышту ці расстрэлу. 6 сакавіка 1918 г. быў заняты будынак Мінскага Савета і арыштаваны ўсе яго члены. У Полацку пры разгоне Савета былі забіты 8 дэпутатаў разам са старшынёй. Арышты і растрэлы мелі месца ў Лепелі, Бабруйску, Барысаве, Слуцку, Быхаве, Міры і іншых гарадах [11, с. 89–90]. Замест Саветаў аднаўляліся гарадскія думы і земскія ўправы, галоўнымі функцыямі якіх сталі забеспячэнне нямецкай арміі прадуктамі харчавання, утрыманне перакладчыкаў, выкананне дапамагатай ролі на ваенных і стратэгічных аб'ектах і г. д. Земствы ў паветах распускаліся і замяняліся нямецкімі ландратамі (*Landrat* – акруговае кіраванне). Усе пасады служачых падлягалі зацвярджэнню нямецкай адміністрацыяй.

Мінская міліцыя была выведзена з-пад юрысдыкцыі гарадскіх улад і пераходзіла пад кіраўніцтва каменданта ці паліцмайстра. Пра тое, якія ей адводзіліся месца і функцыі, сведчыць даклад у гарадскую ўправу, накіраваны яе службовымі асобамі пасля перамоў з нямецкім граданачальнікам Мінска штадтгаутманам Гершам (май 1918). "На пытанне, куды пяройдуць спецыяльныя функцыі штаба міліцыі, як, напрыклад, выдача пашпартоў, адказ быў такім чынам, што ўвогуле ў пашпартах няма неабходнасці, у Мінску жыхарам будуць выдаваць нямецкія пасведчанні, а на выезд – пропускі... Мы спыталі, якімі законамі будуць кіравацца ўлады ў сэнсе работы міліцыі. На гэта нам адказалі: кіравацца будуць нямецкім паліцэйскім правам" [12].

Па ўсёй тэрыторыі акупаванай Беларусі была распаўсюджана юрысдыкцыя нямецкіх ваенных судоў, мясцовыя судовыя органы перайшлі ў іх поўнае падпарадкаванне. Усе дазнанні па крымінальных справах накіроўваліся з крымінальнай паліцыі ваеннаму паліцмайстру, які вырашаў пытанне аб перадачы спраў суду. Уводзіліся трыцейскія суды па спрэчных зямельных і вясковых пытаннях.

Працэс фарміравання нямецкай адміністрацыі ваеннай Обер Ост ішоў даволі хутка і адпавядаў патрэбам ваеннага часу: упарадкаванне акупаваных тэрыторый павінна было адбыцца як мага хутчэй для эканамічнага выкарыстання рэгіёну. На пачатку этапныя інспекцыі на чале з этапнымі камендантамі, трохі пазней вялікі адміністрацыйны штаб, жандармерыя і паліцыя, судовая сістэма, – усе гэтыя інстытуты сталі элементамі механізму рэалізацыі акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны перадзел цягнуўся на працягу ўсяго перыяда акупацыі: змянялася колькасць ваенных акруг, іх межы. Пасля наступлення ў лютым 1918 г. занятыя тэрыторыі былі ўпарадкаваны згодна новаму адміністрацыйнаму і тэрытарыяльнаму прынцыпу. Нямецкая адміністрацыя трымалася на тэрыторыі Беларусі да канца 1918 г., а ў паўднёвых раёнах – нават да студзеня 1919 г.

## Літаратура

1. *Круталевич, В.А.* Рождение Белорусской Советской Республики. (На пути к провозглашению республики: октябрь 1917 – декабрь 1918 гг.) / В.А. Круталевіч. – Минск: Наука и техника, 1975. – 334 с.

2. *Уткин, А.Н.* Первая мировая война / А.Н. Уткин. – М.: Алгоритм-Книга, 2001. – 590 с.

3. *Liulevicius, V.G.* Kriegsland im Osten. Eroberung, Kolonisierung und Militärherrschaft im Ersten Weltkrieg 1914–1918 / V. G. Liulevicius. Hamburg: Hamburger Edition, 2002. – 374 S.

4. *Смальянінаў, М.М.* Трагедыя пачатку ХХ ст. / М.М. Смальянінаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 3. – С. 53–60.

5. *Zemke, H.* Der Oberbefehlshaber Ost und das Schulwesen im Verwaltungsbereich Litauen während des Weltkrieges / Schriften der Kriegsgeschichtlichen Abteilung im Historischen Seminar der Friedrich – Wilhelms – Universität Berlin / H. Zemke. Berlin: Junker und Dünnhaupt Verlag, 1936. – 120 S.

6. Das Land Ober Ost. Deutsche Arbeit in den Verwaltungsgebieten Kurland, Litauen und Bialystok-Grodno. – Berlin – Stuttgart: Verlag der Presseabteilung Ober Ost, 1917. – 472 S.
7. *Людендорф, Э.* Мои воспоминания о войне 1914–1918 гг. / Э. Людендорф. – Минск: АСТ–Харвест, 2005. – 800 с.
8. *Engelhardt, E.* Weissruthenien: Volk und Land / E. Engelhardt. – Amsterdam – Prag – Wien–Berlin: Volk und Reich Verlag. 1943. – 496 S.
9. "Гоман", 1916.
10. Гарадское паліцэйскае ўпраўленне г. Мінска. "Распараджэнне аб арганізацыі ваеннага кіраўніцтва на зноў акупанай вобласці" № 32/18 // Нац. гіст. архіў Беларусі. – фонд 325 – Воп. 1. – Спр.1095. – А.190.
11. Иностранная военная интервенция в Белоруссии 1917–1929 / под ред. И.И. Минца. – Минск: Навука і тэхніка, 1990. – 343 с.
12. Мінская гарадская дума. Справаздача аб перамовах з нямецкім граданачальнікам Мінска штадтгаутманам Гершам // Нац. гіст. архіў Беларусі. – Фонд 24. – Воп. 1. – Спр. 7059. – А. 30.